*І. А.Трушко*
*УА МДПУ імя І. П. Шамякіна (г. Мазыр)*

# ВЫХАВАЎЧЫ АСПЕКТ ЗВЫЧАЮ "ДЗЯДЗЬКАВАННЕ"
(паводле рамана У. С. Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім")

На кожным гістарычным этапе развіцця грамадства актуальна пытанне найлепшага для свайго часу выхавання моладзі. У пошуках новых ідэй мэтазгодна звяртацца да вытокаў, каб прасачыць шлях трансфармацыі выхаваўчых поглядаў. Нацыянальная літаратура, сфарміраваная на этнакультурнай глебе, як ніякі іншы від мастацтва, раскрывае выхаваўчыя традыцыі беларусаў у сацыякультурным развіцці.

Выхаваўчыя аспекты шырока прадстаўлены ў творчасці выдатнага беларускага пісьменніка Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча (1930–1984 гг.). З яго рамана "Каласы пад сярпом тваім" можна даведацца пра асаблівасці арганізацыі выхавання дзяцей беларускай шляхты і сялянства ў першай палове XIX стагоддзя, напярэдадні паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі і Літве пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Твор мае выхаваўчае значэнне, што пацвярджаецца ўключэннем яго ў абавязковае вывучэнне на ўроках беларускай літаратуры ў 10 класе.

У. Караткевіч, гісторык па адукацыі, апісвае і, па сутнасці, уводзіць у грамадскую свядомасць беларускі народна-педагагічны звычай "дзядзькавання", які існаваў у XVI–XVIII стст. Згодна са звычаем, беларускія магнаты і шляхта аддавалі сваіх сыноў на некалькі гадоў на выхаванне ў сялянскія сем'і: аддавалі ў 4 гады, а тэрмін знаходжання ў сялянскай сям'і – 3–5 год. Панічы вучыліся пераадольваць цяжкасці, здабываць і шанаваць хлеб надзённы. Для прыёмнай сям'і прадугледжвалася аплата за выхаванне, "пакормнае" і "дзядзькавое": *"А потым, калі возьмуць хлопца зноў у двор – даюць мужыку пакормнае, за тое, што хлопец з'еў, і дзядзькавое, бо ўсе мы як быццам дзядзькі малому, выхоўвалі яго, розуму вучылі"* [2, с. 17].

Галоўны герой рамана Алесь Загорскі, прадстаўнік княжацкага роду, знаходзіцца ў вялікай сялянскай сям'і Міхала і Марылі Кагутоў. Наяўнасць у сям'і дзяцей (малыя Янька і Юрась, равеснік Алеся – Павал,



ДУ ім. І. П. Шамяк

пятнаццацігадовыя блізняты Андрэй і Кандрат, сямнаццацігадовы Стафан) спрыяе фарміраванню адносін сяброўства, узаемавыручкі, хутчэйшаму ўключэнню ў сялянскае жыццё. Алесь не лічыць сябе чужым, ён эмацыянальна не пагаджаецца з хуткім ад'ездам і са слязамі на вачах пытае: *"Няўжо вы хочаце мяне аддаць. Бацька Міхал?"* [1, с. 26].

Ад дзеда, старога Кагута, які шмат часу праводзіць з дзецьмі і спявае ім "Песню пра жарабя святога Міколы", Алесь атрымлівае першыя ўрокі патрыятычнага выхавання: *"Глядзі, сыне. Песня таемная. Не пры ўсіх нават сваіх можна... Але ўсё адно. Я ўжо чалавек стары. Выслухай маю апошнюю навуку..."* [1, с. 17].

Працэс выхавання адбываецца ў непасрэднай сувязі з роднай прыродай, што станоўча ўздзейнічае на фізічнае і духоўнае развіццё хлопчыка. Алесь разам з названымі братамі вудзіць рыбу на Дняпры, пасе кароў, ганіць коней у начное і начуе каля кастра на лузе. Такім чынам ён набывае практычныя ўменні і навыкі гаспадарчай дзейнасці, фарміруецца як асоба.

Вярнуўшыся ў родны дом, Алесь адчувае сябе неадназначна: выхаваны ў сям'і прыгонных сялян, ён павінен паводзіць сябе, як паніч, нашчадак княжацкага роду. Асаблівасці светапогляду і паводзін хлопчыка, яго прывычка гаварыць па-мясцоваму, а не на французскай мове, напачатку засмучаюць блізкіх, асабліва маці, выклікаюць непаразуменні ў побыце. Але атрыманая маральная і фізічная загартоўка дапамагае Алесю паспяхова пераадольваць цяжкасці, авалодаць замежнымі мовамі і шляхецкімі навукамі, арганічна суіснаваць і ў сялянскім, і ў вышэйшым асяроддзі.

Асноўную мэту "дзядзькавання" вызначае бацька Алеся, Юры Загорскі, у размове з жонкай: *"Я не хацеў, каб сын пайшоў у мяне. Я хацеў, каб ён быў моцны, увесь ад гэта зямлі"* [1, с. 47]. Ён параўноўвае сына з аднагодкамі, якія не адрозніваюць пшаніцы ад ільну, растуць спешчанымі, саслабелымі, і робіць выснову, што якім бы жорсткім ні здаваўся гэты звычай, але ў перспектыве продкі рабілі правільна.

Дадзены звычай станоўча ўздзейнічаў на выхаванне дзяцей вышэйшых саслоўяў, даючы магчымасць паглядзець ім на свет з розных бакоў, набыць такія якасці, як працавітасць, сіла, цягавітасць, непераборлівасць у ежы і адзенні, адданасць роднай зямлі. У наш час падобныя жыццёвыя ўрокі ў пэўнай ступені атрымліваюць гарадскія дзеці, якія часова, на канікулы або па іншых жыццёвых абставінах на больш працяглы тэрмін накіроўваюцца бацькамі да родных у вёску.

**Літаратура**

1. Караткевіч, У.С. Каласы пад сярпом тваім: раман у 2-х кн. / У.С. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1998. – 702 с. – (Залатая серыя. Проза XX стагоддзя).



ПУ ім. І.П. Шамякіна